# Ліст у рэдакцыю

***Галоўнаму рэдактару***
***часопіса «Дзеяслоў»***
***Сачанку Б.П.***

***Шаноўны Барыс Пятровіч!***

*З вялікай цікавасцю сачу за публікацыямі часопіса «Дзеяслоў», які лічу адным з лепшых беларускіх літаратурных выданняў. Сярод самых цікавых публікацый — матэрыялы з творчай спадчыны народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава. Тое, што Ваш часопіс рэгулярна іх друкуе — справа пачэсная, усё, што выйшла з-пад пяра нашага вялікага пісьменніка, заслугоўвае ўвагі і пашаны, і, думаецца, любое выданне Беларусі з радасцю да гэтай справы далучылася б. А звярнуцца да Вас мяне змусіла вось якая акалічнасць. У адным з лістоў за 1998 год Васіля Быкава да свайго маскоўскага сябра і вядомага літаратара Лазара Лазарава, надрукаваным у № 27, гаворыцца пра тое, што «Прэзідэнцкая газета ў серыі нумароў выкрывае падрыўную яго (Пэн-цэнтра — П.Я.) працу, сувязь з ЦРУ і цяпер ужо масонствам і Масадам, апісвае розныя метады падрыўной дзейнасці. І што важна — усіх называюць паіменна, даюць падрабязную характарыстыку. У гэтай іх «распрацоўцы» амаль усе, пачынаючы, зразумела, з Быкава — Барадулін, Бураўкін, Законьнікаў, Тычына, Алексіевіч, Будзінас, Някляеў. Цяпер трэба чакаць аргвывадаў».*

*Сёння словаспалучэнне «прэзідэнцкая газета» выклікае ў чытачоў недвухсэнсоўныя асацыяцыі менавіта з газетай «Советская Белоруссия», паколькі гэта адзінае перыядычнае выданне, сузаснавальнікам якога з’яўляецца*

*Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аднак за той час, як я выконваю абавязкі галоўнага рэдактара газеты, а менавіта з 1995 года, я не згадаю выпадкаў, каб шэльмаваліся (тым больш праваючы перасслед) імёны Васіля Быкава, Міхася Тычыны ды іншых вартых павагі творцаў. Пазіцыя газеты ў адносінах да культурнай эліты грамадства ўзважаная, я асабіста ніколі не дазволіў бы, каб на яе старонках зневажаўся чалавек сумленны і таленавіты. І ўжо тым болей ніколі я не апускаюся да «шальмавання», абвінавачванняў кагосьці «у сувязях з Масадам і масонамі». Чытаць такое пра «прэзідэнцкую газету» у часы майго рэдактарства – горка і смешна... І крыўдна.*

*Вядома, словы класіка належаць вечнасці. Але хацелася б усё-ткі атрымаць некаторыя ўдакладненні ад тых, хто рыхтаваў ліст Васіля Быкава да друку. Калі Васіль Быкаў згадвае не пра наша выданне, з боку рэдакцыі часопіса было б прыстойна даць адпаведныя каментарыі, у тым ліку і надрукаваць гэты мой допіс. Вельмі не хацелася б, каб з-за нейкай недагаворанасці ў тых, хто будзе чытаць ліст Васіля Быкава, складалася перадузятае меркаванне пра газету «Советская Белоруссия». Лічу, што справа — у дробным непаразуменні, якое можа быць лёгка вырашана.*

*Застаюся вашым удзячным чытачом.*

*З павагай*

***Рэдактар газеты***
***«Советская Белоруссия»*** ***Павел Якубовіч.***

**Слова ад «Дзеяслова».** Мы пакідаем гэты ліст без разгорнутага каментара, бо ўсе акцэнты тут расстаўленыя дакладна і бездакорна. Зразумела, што рэдакцыя, рыхтуючы да друку лісты Васіля Уладзіміравіча Быкава, выканала чыста механічную работу: падала іх бяз правак, строга захоўваючы кожнае напісанае слова. Ня будзем тут гадаць, што меў на ўвазе Васіль Уладзіміравіч пад зваротам «прэзідэнцкая газета», ня будзем шукаць у тым часе і дакладную цытату, на якую спасылаецца Васіль Уладзіміравіч. Лічым гэта ня столькі важным, бо, зразумела, што ў 1998 годзе ён мог алегарычна назваць «прэзідэнцкім» любое афіцыйнае дзяржаўнае выданьне. Пагаджаемся і з тым, што пазіцыя газеты «Советская Белоруссия» ў адносінах да культурнай эліты грамадства заўсёды была ўзважанай, і яна ў сваіх публікацыях не апускаецца да «шальмавання», абвінавачваньняў кагосьці «у сувязях з Масадам і масонамі»... Застаемся ўпэўненымі, што публікацыя «Дзеяслова» лістоў В. Быкава да Л. Лазарава не была памылкаю, што і сапраўды «словы класіка належаць вечнасьці».